УДК 821:161.3:398.2

# Ідэйна-мастацкі свет казкі “Нямоглы бацька” У. Караткевіча

***Падстаўленка В.Ф.***
*Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск*

*У артыкуле на матэрыяле названай казкі раскрыты ідэйна-тэматычныя, вобразныя і жанрава-стылявыя складнікі аўтарскага дыскурсу У. Караткевіча.*

*Мэта – выявіць дамінантныя ідэйна-мастацкія адметнасці казкі “Нямоглы бацька” У. Караткевіча.*

***Матэрыял і метады.*** *Матэрыялам даследавання ў артыкуле стала казка “Нямоглы бацька” як самабытны прыклад сінтэзавання ў мастацкім свеце народных маральных імператываў, увасобленых у адпаведных сюжэтах, з творчымі распрацоўкамі Караткевіча. Базавымі для навуковага аналізу абраны прыёмы канкрэтна-гістарычнага, структурна-тыпалагічнага і дэскрыптыўнага метадаў.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Пытанню станаўлення існых гуманістычных імператываў прысвечана казка Караткевіча. Неміласэрнасць і жорсткасць да “нямоглых” бацькоў падаюцца ў творы не як адзінкавы жахлівы выпадак, а як сацыяльная норма.*

*Тут маюць месца дуалістычнасць асобных вобразаў (ваўка, велікана і інш.), нечаканая шматузроўневасць інтэрпрэтацыі мастацкіх дэталей.*

*Гэты твор засведчыў, наколькі важнай была для пісьменніка арыентацыя на лепшыя прыёмы і сродкі фальклорнай казачнай традыцыі. Прааналізаваны празаічны прыклад мае выключны выхаваўчы патэнцыял.*

***Заключэнне.*** *Можна доказна канстатаваць, што папулярнасць твора “Нямоглы бацька” тлумачыцца самабытным ідэйна-мастацкім сінтэзам, які грунтуецца на народным казачным свеце, сімвалічных вобразах з праекцыяй на сусветны духоўны і культуралагічны базіс, глыбокім маральным і гуманістычным сэнсе падзей.*

***Ключавыя словы:*** *аўтарская казка, народныя маральныя імператывы, індывідуальны стыль, сістэма вобразаў, сімвалізм.*

*(Ученые записки. – 2018. – Том 28. – С. 132–135)*

# Ideological and Artistic World of the Fairy Tale “Helpless Father” by V. Karatkevich

***Podstavlenko V.F.***
*Educational Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”, Vitebsk*

*In the article on the material of the aforementioned tale the ideological and thematic, the figurative and the genre and stylistic components of the author's discourse of V. Karatkevich are revealed.*

*The purpose of the article is to identify the dominant ideological and artistic features of the tale “Helpless Father” by V. Karatkevich.*

***Material and methods.*** *The research material in the article was the fairy tale “Helpless Father” as a unique example of synthesizing in the art world people's moral imperatives which were embodied in the relevant subjects, with creative designs of Karatkevich. The base chosen for scientific analysis was techniques of concrete historical structurally-typological and descriptive methods.*

***Findings and their discussion.*** *The issue of shaping existing humanitarian imperatives the tale by Karatkevich is devoted. Mercilessness and cruelty to the “weak” parents are presented in the work, not as a single monstrous case, but as a social norm.*

*Here occurs duality of individual images (wolf, giant etc.), unexpected multilevel interpretation of artistic details.*

*This work illustrates how important it was for the writer to focus on the best ways and means of fairy folk tradition. The analyzed prosaic example is of an exceptional educational potential.*

***Conclusion.*** *It can be conclusively stated that the popularity of the work “Helpless Father”, is explained by the distinctive ideological and artistic synthesis, which is based on the popular fairy-tale world, symbolic images with the projection on the global spiritual and cultural basis, a deep moral and humanistic meaning of the events.*

***Key words:*** *author's tale, folk moral imperatives, individual style, imagery, symbolism.*

*(Scientific notes. – 2018. – Vol. 28. – P. 132–135)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: podstavlenko.v.@yandex.by –* ***В.Ф. Падстаўленка***

Сярод цудоўных казак Уладзіміра Караткевіча найбольш вядомым для маленькіх і вялікіх чытачоў з'яўляецца твор "Нямоглы бацька". Такая ўвага рэцыпіентаў дэтэрмінавана і яго самабытным мастацкім светам, у сутнасці якога і варта разабрацца для аб'ектыўнага погляду на гэты літаратурны прыклад.

Мэта артыкула – выявіць дамінантныя ідэйна-мастацкія адметнасці казкі "Нямоглы бацька" У. Караткевіча.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання ў публікацыі стала казка "Нямоглы бацька" як самабытны прыклад сінтэзавання ў мастацкім свеце народных маральных імператываў, увасобленых у адпаведных сюжэтах, з творчымі распрацоўкамі Караткевіча. Базавымі для навуковага аналізу абраны прыёмы канкрэтна-гістарычнага, структурна-тыпалагічнага і дэскрыптыўнага метадаў, што дэтэрмінавалі аб'ектыўнасць ацэнак названага твора.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Першае, што адразу заўважаецца ў казцы, – гэта звышаддалены хранатоп з акцэнтаваным апісаннем нябесных свяцілаў, якія рэпрэзентуюцца як надзвычай важныя аб'екты ў сусветнай прасторы. Дадзеная акалічнасць набліжае тэмпаральнасць аповеду да міфалагізаванай гісторыі, дзе тлумачацца пэўныя анталагічныя моманты ці вечныя маральна-этычныя імператывы. Падобная інфармацыйная скіраванасць твора поўнасцю пераконвае ў небудзённасці далейшых падзей.

З самага пачатку казкі Караткевічам пазіцыянуецца апісаны пазагістарычны момант як перыяд дамінаванай дзікасці: "Дзікія былі людзі. Дзікія-найдзікія. Аж цяпер сорамна ўспамінаць пра іх, такія дзікія. Як убачаць, што маці або бацька больш на сонейку грэецца, чым косіць ці жне, дык адразу завозяць іх на калёсах або на санях у глухі лес" [1, с. 494–495]. Такім чынам, гэта быў час, калі жылі дзікія людзі, нібы дзікія звяры ў дзікай пушчы.

Маркіраваны эпітэт *дзікі* набыў у творы канцэптуальны сэнс, і *дзікасць* тут не столькі антынамічна *сучаснасці* і *цывілізацыі*, колькі *маральнасці, спагадлівасці* і *міласэрнасці паміж роднымі людзьмі*. У гэтым ідэйны змест "Нямоглага бацькі" блізкі да казкі "Кошка, што гуляла сама па сабе" Р. Кіплінга і (асабліва) аповесці "Чалавек ідзе" Я. Маўра. Прычыны апелявання згаданых пісьменнікаў да "дзікай" даўніны бачацца ў тым, каб недапусціць паказаныя ў творах аберацыі ў сённяшнім грамадстве. Калі ў казцы Кіплінга дадаткова сцвярджаецца думка, што ў першабытным перыядзе яшчэ толькі фарміруюцца звыклыя нам формы стасункаў паміж чалавечым светам і жывёльным, то ў праблематыцы згаданага твора Маўра разглядаецца аднолькавае з Караткевічам кола маральна-этычных і міжасабовых паняццяў. Як вядома, у аповесці "Чалавек ідзе" гарантам правільнага развіцця нашай эвалюцыі быў вектар, накіраваны ў бок чалавекалюбства.

Пытанню станаўлення існых гуманістычных імператываў прысвечана і казка Караткевіча. Што цікава, неміласэрнасць і жорсткасць да "нямоглых" падаюцца ў творы не як адзінкавы жахлівы выпадак, а як сацыяльная норма: "Такі быў Закон. І хто Закона трымаўся, таго хвалілі. А хто не трымаўся, таго маглі выгнаць у дзікую пушчу. <…> Бо жылі гэтыя людзі па адзіным законе – законе карысці" [1, с. 495]. У казцы раскрываецца трагічны парадокс замененай легітымнасці на антылегітымнасць, падмены сапраўдных каштоўнасцей. Пры гэтым Караткевіч глыбока аналізаваў у тэксце важкія аспекты карэляцыі паміж законам і грамадствам, законам і сям'ёй, грамадзянскім абавязкам і асабістым (унутрысямейным) шчасцем. Праз ланцуг драматычных падзей аўтарам прадэманстравана амаральная, злачынная сутнасць агульнапрызнанага псеўдазакона і неабходнасць замацаваць у легітымным статусе новы Закон, які будзе базіравацца на сумленнасці, узаемапавазе, дабрыні, чуласці, згодзе. Як сцвярджаецца ў творы, нават абсурдныя законы могуць быць трансфармаваны, але толькі пры ўмове іх прыняцця грамадой.

У казцы робіцца спроба разабрацца ў прычынах панавання жахлівых парадкаў. Невыносныя ўмовы існавання, пры якіх маюць каштоўнасць толькі практычныя ўменні асобы, нараджаюць дзікіх людзей: "Страшэнна цяжка, у голадзе і холадзе, жылі тыя дзікія людзі. Частыя былі неўраджаі, таму запасаў аніякіх не было і быць не магло. А ўродзіць некалькі гадоў запар – з'явяцца ворагі. <…> Таму кожныя рукі лічыліся: ці могуць яны яшчэ трымаць касу ці меч? А калі ўжо не могуць, калі толькі кавалак да рота нясуць – нашто яны?" [1, с. 495]. Прадбачачы абурэнне рэцыпіентаў ад жорсткай логікі ў прыведзеным тэксце, аўтар нівеліруе гэты інфармацыйны прагматызм за кошт ужывання прыёму сказавай нарацыі – непасрэднага апелявання да чытача: "Ты пачакай іх да канца вінаваціць" [1, с. 495]. Тут відавочна акрэслілася пісьменніцкае стаўленне да герояў, яго жаданне актывізаваць увагу на падзеях, стварыць мастацкую ілюзію дыялагічнасці. Далейшы змест твора даказвае, што сказавасць уваходзіць у стылявы базіс і гэтай казкі Караткевіча. Пісьменнік архаізуе тут хранатоп, шматдэталёва дапаўняе народны каларыт

гісторыі, трансфармуе ўласны літаратурны праект у фальклярызаваную нарацыю.

Арыентуючыся на шматузроўневасць лепшых сусветных казак, Караткевіч у “Нямоглым бацьку” надаў сімвалічны сэнс асобным вобразам і мастацкім фактам. Гэта перадусім адлюстравалася ў рэцэпцыі канцэпту *дзікасць*, а таксама на прыкладзе іншых полісемантычных вобразаў: ваўка, грамады, замка і іншых. Спынемся на дадзеным аспекце больш падрабязна. Вобразы ваўкоў у творы спачатку падаюцца як мастацкае ўвасабленне лютасці, драпежніцтва ў чалавечым характары, таму, паводле аўтарскай задумы, адразу карэлююць з вобразам цэнтральнага антыгероя Гната: “І было ў таго Гната багата <…> і таму, як воўк за падлу, болей іншых трымаўся ён за Закон, і быў той Гнат самы большы гад” [1, с. 495]. Адпаведнае стаўленне да персанажа ўзмацняецца ў фінале твора, калі грамада асудзіла мізантрапічную пазіцыю героя: “А калі ўжо гнаць кагосьці ў пушчу, дык гэта цябе. Ідзі, вый там на ветах, воўк” [1, с. 501]. Дарэчы, невыпадкова згадваецца тут ветах – месяц у апошняй квадры, на зыходзе. Знікае час панавання Гнатавых законаў, і гэта трапна падкрэсліваецца нават праз адзначаную дэталь. Экстрапаляцыя вобраза ваўка назіраецца і ў дачыненні да станоўчых персанажаў Пятра і яго бацькі: “Прынёс Пятро бацьку ў хату, адгарадзіў частку каморы і зрабіў там пралазы на гару і ў падмосце. <…> І там бацька стаў жыць. <…> Як ваўкі жылі, ад усіх хаваючыся. Але жылі” [1, с. 497]. Дзякуючы абсалютна матываванаму ўжыванню паўтораў зразумець аўтарскую думку дастаткова лёгка і без іншых мастацкіх падказак. Полісемантызм вобраза ваўка дазволіў аўтару раскрыць драпежніцкую сутнасць чалавека, асэнсаваць драматычны стан адрынутага ўсімі ізгоя і непераадольнае жаданне асобы выжыць у катастрафічных абставінах. Самабытна прэзентуецца аўтарам і эвалюцыя абагульненага вобраза натоўпу. У хранатопе казкі перманентна згадваецца супольны дуб (вядомы сімвал моцы і мудрасці), пад якім прымаюцца важныя рашэнні. Менавіта тут грамада спачатку “шуміць, віруе”, як вялікая стыхія, бо, паводле старога Закону, варта выгнаць нямоглага бацьку Пятра. Пасля натоўп ахапіў сум ад неабходнасці выканаць маральна цяжкі прысуд. Падчас далейшых выпрабаванняў грамада раўла ад безнадзейнасці, а потым, прыбітая горам, маўчала. І вось, калі большасць прымае праўду Пятра, пачынае трансфармавацца агульны светапогляд: “І тут натоўп зароў. Уся ярасць на Закон, увесь адчай і ўся палёгка выліліся ў рыку” [1, с. 501]. Гэты звярыны (нечалавечы) рык гучаў як адчуванне сваёй моцы і спазнанне ісціны, як знак неўтаймаванай волі, нязгоды, мысленчага пералому, гневу і мужнасці ў прыняцці новага важнага рашэння. Такім чынам, Караткевічам аналітычна асэнсаваны этапы змяненняў чалавечых перакананняў: 1) пазбаўленне ад сацыяльных стэрэатыпаў; 2) адкрыццё надчалавечай (ці агульнажывёльнай) схемы паводзін і мыслення; 3) асэнсаванне імператываў Быцця, што знітоўваюць усё на Зямлі. У выніку аўтарам дэманструецца дастаткова парадаксальная сітуацыя, у адпаведнасці з якой асобе, каб стаць носьбітам шчырай гуманістычнай пазіцыі, неабходна апеляваць да глыбінных звярыных пачаткаў. Толькі так у чалавека ёсць шанц пазбавіцца ад асабістай папулярызацыі сацыяльных аберацый (злачынстваў), што маюць легітымную падтрымку. Сімвалічны сэнс у казцы мае і вобраз замка, створанага пачварным Веліканам: “Наламаў бярвенняў, зрабіў на самай гіганцкай асіне падмосце, а на падмосці з валуноў пабудаваў сабе замак” [1, с. 499]. Само каменнае збудаванне на дрэве ўспрымаецца недарэчна, гратэскава і асацыіруецца з вобразам хаткі Бабы Ягі. А прыклад апошняй па сутнасці ўяўляе сабой штосьці ненадзейнае, хісткае, пазбаўленае традыцыйнай логікі, гэта і пэўная прамежкавая прастора, “мост” паміж светам жывых і нябожчыкаў.

Апроч адзначанага, выклікае цікавасць і выбар дрэва ў прыведзеным эпізодзе. Нагадаем, што ў казцы “Вужыная каралева” Караткевіч творча інтэрпрэтуе пэўную раслінную сімволіку, у тым ліку прыводзіць і народную верыфікацыю вобраза асіны: “А на краі балота стаіць усімі клятая асіна. Ніякае дрэва не плача так, калі апынецца ў печы. Шчэ далёка дні восені і халады, а яна ўжо ўся чырванее, загадзя перад усімі схіляецца. А калі ўжо загадзя схіляецца – значыцца, поскудзь – дрэва” [2, с. 49]. Як бачна, у сістэме народнага светабачання вобраз асіны набыў выразныя негатыўныя канатацыі.

У “Нямоглым бацьку” само знаходжанне страшнага замка на асіне іншасказальна можа ўспрымацца як цэнтр улады, што грунтуецца на гвалце, плачы, злачынствах, палахлівасці і пакорлівасці. Па імператывах казачнага свету вобраз Веліканa прэзентуецца як Зло, перамагчы якое ў абставінах генерацыйнай ізаляванасці, фактычна, немагчыма. У сувязі з гэтым у творы праводзіцца ідэя, што толькі боль, абурэнне і мальба самых слабых і пакрыўджаных (у казцы гэта вобразы сірот) і жыццёвы досвед старэйшых здатны перайначыць самыя вялікія няшчасці. Фінал аналізаванага эпізоду ўключае яшчэ адзін варты ўвагі мастацкі штрых – пасля пераможнага змагання

на небе зазззяла вясёлка як сімвал дасягнутага шчасця і знак повязі пакаленняў.

Творчая шматузроўневасць інтэрпрэтацыі характэрна і для некаторых іншых вобразаў-дэталей у творы, прыкладам таму можа паслужыць цяпельца, пакінутае Пятром каля бацькі ў начным гушчары: “Бяжыць ён (Пётр. – *В.П.*) на агонь. Галіны яму вочы высцёбваюць. А агонь зусім згасае. І нібы згасае ля яго скручаная постаць” [1, с. 497]. Тут агонь набывае пэўнае метафізічнае сузначэнне, звязанае з жыццесцвярджальным пачаткам і надзеяй на лепшае. Сімвалічна абыгрываюцца ў творы і імёны цэнтральных герояў-антаганістаў. Нагадаем, што імя *Пётр* у перакладзе са старажытнагрэцкай мовы азначае “*каменны*”. Такім непахісным, цвёрдым характарам надзелены і герой казкі. Да таго ж у пераломнай сцэне (калі грамада пачынае задумвацца над новымі ісцінамі) этымалагічнае напаўненне імя персанажа экстэнсіфікуецца: “Гнат зноў баламуціць. І людзі ўжо з рукамі да Пятра падступіліся. А той стаіць спакойна і паверх галоў глядзіць на дрэва” [1, с. 500]. Тут вобраз Пятра відавочна ўзвышаецца, як выспа ці гара, над натоўпам, бо толькі ён здатны ўбачыць недасяжнае.

Варта таксама дадаць, што ў творы мае месца дуалістычнасць асобных вобразаў. Гэта было намі заўважана ў дачыненні да вобраза ваўка, тое ж адбываецца і з вобразам велікана. Яго першая мадыфікацыя дэманструе носьбіта абсалютнага Зла, а другая, зкарэляваная з пратаганістам, становіцца сімвалам духоўнага ўзвышэння асобы ў мудрасці і праўдзе.

У. Караткевіч, так бы мовіць, шмат “гуляе” ў тэксце з семантычнымі і фанетычнымі нюансамі слоў. Наўпрост гэта выявілася ў імені Гнат: герой апантана *выганяў* іншых на смерць, і, урэшце, дачакаўся свайго *выгнання* ў пушчу. З імем Гнат (Ігнат) звязаны яшчэ адзін займальны аспект. Дадзенае імя можна перакласці як *вогненны*, што дазваляе гаварыць пра дуалістычнасць і вобраза агня ў казцы. Адзначаны вобраз пазіцыянуецца тут як поўнасцю жыццестваральны сімвал і (дзякуючы антыгерою) як дэструктыўны вобраз.Твор “Нямоглы бацька” зноў засведчыў, наколькі важнай была для Караткевіча арыентацыя на лепшыя прыёмы і сродкі фалькорнай казачнай традыцыі. Разгледжаны прыклад мае выключны выхаваўчы патэнцыял, што дэтэрмінавана і ўдалым выкарыстаннем у тэксце мудрых народных выслоўяў, прыказак і прымавак: “Як ты віншуеш, так і табе дзякуюць” [1, с. 495], “Жылі сілай, а розум забівалі” [1, с. 500], “Знішчалі «ўчора» і таму не мелі права на «заўтра»” [1, с. 500], “Добрай мудрасцю за злосную дурасць” [1, с. 501].

Адначасна пісьменнік, як у любым іншым сваім творы, імкнуўся адысці ад “сухой” канстатацыі ў выкладанні важных сентэнцый. З гэтай прычыны аўтарам быў распрацаваны падзейна прывабны для рэцыпіентаў сюжэт, насычаны выпрабаваннямі, спраектавана яркая вобразная антаганістычнасць са слабой надзеяй на перамогу Дабра і іншае. Зрэшты, больш лёгкай рэцэпцыі твора спрыяла і яго сказавасць, з камунікацыйным “пасылам” да кожнага “слухача” дзівоснай гісторыі. Да таго ж Караткевічам у казачны дыскурс, набліжаны да народнай фантастычнай нарацыі, быў прыўнесены ўдалы кампанент мастацкага псіхалагізму. Згадаем адзін з адпаведных прыкладаў, калі ў творы асноўныя падзеі толькі набліжаюцца да сваёй кульмінацыі: “Пятро праехаў моўчкі. Прыняў іх (з бацькам. – *В.П.*) разам з калёсамі мокры і чорны лістападаўскі лес. <…> Зрабіў Пятро з яловага лапніку будан, паклаў у салому торбу. <…>

Гэта нашто? – спытаў бацька. – Бяры ўсё. І салому бяры.

Татка, – глуха сказаў Пятро, – няўжо ты думаеш, што я цябе тут пакіну?” [1, с. 496].

У адзначаным урыўку, думаецца, неабходна спыніцца на словазлучэннях *праехаў моўчкі* і *глуха сказаў*. Роздумнасць Пятра ў час апошняй бацькавай паездкі ў пушчу перадае драматычную напружанасць героя ў момант прыняцця складанага выбару. Глухі, цяжкі адказ бацьку тлумачыцца інтраспектыўнай барацьбой персанажа, які з болем пераадольваў злачынны закон, нішчыў яго ў сваёй душы.

Дынамічна раскрыў У. Караткевіч у казцы працэс з'яўлення існага Закону і асноўныя ідэі твора прэзентаваў як сэнсава значныя сентэнцыі-парады: “Шануйце дабрыню, хай і слабую. Шануйце мудрасць, хай сабе нямоглую. Насіце на руках бацькоў…” [1, с. 501]. Гэтыя думкі, безумоўна, памнажаюць філасофскі і выхаваўчы план прааналізаванай казкі.

**Заключэнне.** Можна канстатаваць, што папулярнасць твора “Нямоглы бацька” тлумачыцца самабытным ідэйна-мастацкім сінтэзам, які грунтуецца на народным казачным свеце, сімвалічных вобразах з праекцыяй на сусветны духоўны і культуралагічны базіс, глыбокім маральным і гуманістычным сэнсе падзей.

## Літаратура

1. Караткевіч, У. Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1988. – Т. 2: Аповесці, апавяданні, казкі. – 511 с.
2. Караткевіч, У. Вясна ўвосень: казкі / У. Караткевіч. – Мінск: Юнацтва, 2000. – 80 с.

*Пастýпіў у рэдакцыю 21.11.2018 г.*